4. КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференциях (1898 – 1954). В 4 т. Изд. 7-е доп. – Т. 1. – М.: Госполитиздат, 1954.
5. Ленин, В.И. Полное собрание сочинений. В 55 т. – 5-е изд. – М.: Госполитиздат, 1958 – 1965.
6. Декреты Советской власти. В 2 т. – Том I. 25 октября 1917 г. – 16 марта 1918 г. – М.: Госполитиздат, 1957.
7. Народный комиссариат по делам национальностей. Отчет о деятельности (1 ноября 1917 г. – 20 июня 1918 г). – М., 1918.
8. Ковкель, И.И., Сташкевич, Н.С. Почему не состоялась БНР? (Из истории политического банкротства националистической контрреволюции в Белоруссии. 1918 – 1925 гг.). – Минск: Голас Радзімы, 1980.
9. Булат, Б.В. История выборов во Всероссийское Учредительное Собрание и Гражданской войне в России (1918 – 1922). Атлас. 3-е изд. – СПб.: Нестор-История, 2016.

**Даніловіч Вячаслаў Віктаравіч**

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (Мінск, Беларусь)*

## МОЛАДЗЬ У НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЗЯРЖАЎНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ БССР У 1920-Я ГАДЫ

Паспяховае рашэнне пытанняў нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў БССР залежала ад цэлага шэрагу ўмоў і фактараў. Адным з найважнейшых з іх з'яўлялася забеспячэнне падтрымкі савецкай улады球 рознымі пластамі насельніцтва, асабліва моладдзю.

Гаворачы аб прадстаўніцтве маладога пакалення ў органах улады і кіравання Савецкай Беларусі, перш за ўсё, неабходна звярнуць увагу на камсамол, які, як вядома, быў створаны ў якасці апоры і сродку распаўсюджвання ўплыву новай бальшавіцкай улады ў маладзёжным асяроддзі. Гэтай арганізацыі адводзілася важная роля ў палітычнай сістэме краіны. Менавіта камсамол павінен быў ісці ў авангардзе прадстаўніцтва моладзі ў органах улады і кіравання. Яму аказвалася вялікая падтрымка на дзяржаўным узроўні.

Ужо з мая 1921 г. КСМБ накіроўваў у дзяржаўныя ўстановы ССРБ камсамольцаў-практыкантаў. Акрамя таго IV Усебеларускі з’езд Саветаў 14–18 снежня 1922 г. прыняў рэзалюцыю з заклікам аб аказанні дапамогі камсамолу рэспублікі. Прадстаўнікі КСМБ былі абраныя ў ЦВК БССР і на X Усерасійскі з’езд Саветаў, уведзены ў калегію Наркамата асветы рэспублікі з правам вырашальнага голасу. ЦК камсамола БССР меў прадстаўнікоў ва ўпраўленні ўпаўнаважанага Рэўваенсавета рэспублікі – вышэйшага калегіяльнага органа кіравання ўзброенымі сіламі, а таксама пры цэнтральным ваенным камісарыяце БССР, у Белдзяржвыдавецтве [1, арк. 113; 2, арк. 1; 3, арк. 90, 133].

У сакавіку 1924 г. у ЦВК БССР камсамольцам было выдзелена 4 месцы (2 з вырашальным голасам і 2 кандыдацкіх (для камсамольца-рабочага і камсамольца-селяніна), а таксама 1 месца ў прэзідыуме з’езду Саветаў рэспублікі (туды і ў ЦВК быў абраны першы сакратар ЛКСМБ М. Арэхва) [2, арк. 26]. У той жа час выразна прасочваецца тэндэнцыя да павелічэння прадстаўніцтва моладзі ў органах улады і кіравання, асабліва ў Саветах.

Разам з тым, у пачатку 1920-х гг. адсутнічала зладжаная сістэмная камсамольская дзейнасць у Саветах і іншых органах дзяржаўнага кіравання.

Толькі з 1924 г. гэтая праца актывізавалася ў выніку чаго назіраўся рост колькасці членаў ЛКСМБ у Саветах, выканкамах і іншых дзяржаўных органах [4, с. 39–42]. У сельсаветах камсамольцам, як правіла, даручалася адказная праца, многіх з іх абіралі сакратарамі і старшынямі. Сярод такіх камсамольцаў былі вядомыя ў будучым беларускія пісьменнікі Пятрусь Броўка, Платон Галавач, Пятро Глебка, Паўлюк Трус. Аднак, нягледзячы на павелічэнне агульнай колькасці камсамольцаў у Саветах, арганізацыя іх працы там пакідала жадаць лепшага.

Наогул рост колькасці камсамольцаў у Саветах быў нестабільны [5, арк. 3], бо часта камсамольскія ячэйкі выступалі неарганізавана, самі члены саюза не мелі яшчэ трывалага аўтарытэту сярод насельніцтва.

З 1927 г. не толькі камсамольцы, але і несаюзная моладзь сталі ўдзельнічаць у перавыбарах Саветаў больш актыўна, чым раней [6, арк. 50], што можна растлумачыць паляпшэннем агульнага сацыяльна-эканамічнага становішча ў краіне. Камсамол БССР павялічыў сваё прадстаўніцтва ў Саветах рэспублікі. Разам з тым, у Саветах была прадстаўлена і значная колькасць несаюзнай моладзі. Аднак сістэмная арганізацыя працы маладых дэпутатаў па-ранейшаму адсутнічала.

З 1929 г. зноў пачалося зніжэнне колькасці членаў ЛКСМБ у сельсаветах БССР. Камсамольцы складалі менш паловы маладых членаў сельсаветаў [7, арк. 41–42; 8, арк. 288; 9, арк. 1; 10, с. 4]. Гэта відавочна звязана з рэалізацыяй палітыкі калектывізацыі, метадамі правядзення якой сяляне былі незадаволеныя.

У цэлым перавыбары сельсаветаў у 1920-я гг. з'яўляліся арэнай палітычнай барацьбы заможнага сялянства за свае інтарэсы і ўплыў на вясковую моладзь. Зыходзячы з адносна невялікага прадстаўніцтва камсамольцаў у сельсаветах, можна сцвярджаць, што як мінімум у першай палове 1920-х гг. гэта барацьба была для заможнага сялянства даволі паспяховай.

Прычынай такой з'явы была адсутнасць у кіраўніцтва ЛКСМБ добра прапрацаванай стратэгіі ўдзелу ў перавыбарах Саветаў і арганізацыі працы камсамольцаў-дэпутатаў. Акрамя таго, можна ўпэўнена сцвярджаць, што ў 1920-я гг. у камсамоле мелася пэўная апазіцыя палітыцы кампартыі ў саветах. Актыўныя праявы гэтай апазіцыі асабліва павялічыліся з пачаткам правядзення масавай калектывізацыі [6, арк. 5; 11, арк. 11; 12, арк. 57].

У сярэдзіне 1920-х гг. ЛКСМБ шмат увагі надаваў дзейнасці ў органах Народнага камісарыята працы БССР, асабліва ў яго інспекцыі. У органах наркамата працавалі больш за 100 камсамольцаў, а пазаштатны актыў налічваў звыш 1 тыс. членаў саюза. Кожны інспектар працы меў асістэнта з ліку камсамольцаў, які займаўся ў асноўным праверкай становішча маладых рабочых на вытворчасці. Да такіх праверак прыцягваўся шырокі камсамольскі актыў, што дазваляла абследаваць штомесяц 15–20 буйных і 100 дробных прадпрыемстваў [13, с. 137].

У другой палове 1920-х гг. у БССР пашырылася ўзаемадзеянне рабочай і сялянскай моладзі з органамі Рабоча-сялянскай інспекцыі [14, арк. 61].

Аднак на працягу 1920-х гг. юнакі і дзяўчаты слаба ўдзельнічалі ў рацыяналізацыі дзяржапарату БССР [15, арк. 2], што сведчыць аб адсутнасці сістэмнасці ў арганізацыі гэтай працы з боку дзяржавы і камсамола. Больш за тое, адсутнічала і адладжаная сістэма ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў не толькі з моладдзю, але і з ЛКСМБ.

У цэлым на пачатак 1930 г. у дзяржаўным апараце БССР налічвалася 2550 чалавек моладзі, з якіх толькі 32 % з'яўляліся камсамольцамі. На 83 % гэта была моладзь ва ўзросце ад 20 да 24 гадоў. Толькі 4 % ад агульнай колькасці камсамольцаў у дзяржаўным апараце займалі кіруючыя пасады [8, арк. 285, 297].

Маладыя людзі ў дзяржаўным апараце БССР займалі пераважна пасады ніжэйшага і сярэдняга звяна, што цалкам зразумела. Аднак камсамол ахопліваў гэтую моладзь толькі крыху больш чым на траціну, а значыць, не меў на яе шырокага ўплыву, і гэта, нягледзячы на дэкларавaную дзяржавай і кампартыяй падтрымку яго дзейнасці. Такое становішча можна растлумачыць толькі значнымі недапрацоўкамі камсамольскага кіраўніцтва ў гэтым кірунку.

Тым не менш палітыка вылучэння камсамольцаў і моладзі на дзяржаўныя пасады не спынялася на працягу ўсяго разглядаемага перыяду.

Адной з асноўных задач, пастаўленых перад камсамолам, была арганізацыя палітычнай асветы або т. зв. «ліквідацыі палітычнай непісьменнасці» юнакоў і дзяўчат (у першую чаргу камсамольцаў). Прадстаўнікі камсамольскіх структур уваходзілі ў калегіі палітасветных камітэтаў БССР.

Наогул на пачатковым этапе разглядаемага перыяду маладзёжная палітасветработа вялася ў асноўным на рускай мове, несістэматычна і выбарачна, не хапала палітк іраўнікоў, неабходных дапаможнікаў і фінансавых сродкаў. Ахоп палітасветай камсамольцаў і іншай моладзі быў мізэрным, асабліва на вёсцы, Узаемадзеянне з палітасветкамамі і камітэтамі КП(б)Б не было належным чынам арганізавана.

Толькі ў 1923 г. становішча з маладзёжнай палітасветай пачало мяняцца. Па ініцыятыве камсамольцаў у навучальных установах ствараліся гурткі палітпісьменнасці, працавалі палітгурткі 1-й і 2-й ступеняў. Аднак сістэма маладзёжнай палітасветы не была адладжана [11, арк. 42].

У 1928 г. дзяржава і кампартыя ўзмацнілі ўвагу да палітычнай адукацыі маладога пакалення. Асабліва пільная ўвага была звернута на маладзёжныя газеты і часопісы. Сам І. Сталін трымаў іх пад асабістым кантролем і выказваў у друку свае меркаванні аб накіраванасці публікацый маладзёжных СМІ [16, с. 363–364]. Такую ўвагу можна растлумачыць абвастрэннем палітычнай барацьбы з унутрыпартыйнай апазіцыяй. У выніку адбылося пэўнае паляпшэнне палітасветы камсамольцаў і несаюзнай моладзі [17, арк. 110; 18, арк. 37–38; 19, арк. 2].

Разам з тым, улады і грамадскія арганізацыі, у тым ліку камсамол, імкнуліся да вырашэння праблем міжнацыянальных адносін. Гэтае пытанне неаднойчы абмяркоўвалася ў дзяржаўных органах і грамадскіх аб'яднаннях.

Камсамол шмат увагі надаваў інтэрнацыянальнаму выхаванню падрастаючага пакалення. У камсамольскіх клубах ладзіліся адпаведныя выставы, чыталіся лекцыі, праводзіліся вечарыны. Усе камсамольцы былі членамі Міжнароднай арганізацыі дапамогі рэвалюцыянерам. Камсамольскія структуры БССР вялі рэгулярную перапіску, мелі сталыя сувязі з арганізацыямі камсамола Заходняй Беларусі, Польшчы і Літвы. У прыватнасці Выканкам Камуністычнага інтэрнацыянала моладзі на чале з В. Вуёвічам у снежні 1923 г. адобрыў садружнасць камсамольскіх арганізацый БССР і Літвы [20, с. 147–148].

Тым не менш з-за таго, што адбываліся складаныя, шмат у чым радыкальныя грамадска-палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і духоўна-культурныя ператварэнні, многія маладыя людзі не разумелі сутнасці палітыкі кампартыі па будаўніцтву новага грамадства. Стварэнне і дзейнасць камсамола таксама з'яўлялася новым і нязвыклым фактарам арганізацыі маладзёжнага, у тым ліку нацыянальна-дзяржаўнага, жыцця.

Да таго ж да верасня 1924 г. інтэрнацыянальнае выхаванне маладога пакалення і нацыянальная праца сярод яго вяліся эпізадычна. У маладзёжным асяроддзі, нават сярод камсамольцаў, назіралася нацыянальная рознь [3, арк. 157–158; 11, арк. 28, 31; 21, арк. 4; 22, арк. 29; 23, арк. 36].

Праца на родных мовах яўрэяў, палякаў і латышоў у камсамоле амаль не вялася. Мала займаліся камсамольскія ячэйкі і беларусізацыяй. У актывістаў саюза адзначалася няўвага да ўліку нацыянальных момантаў у працы [22, арк. 3; 24, арк. 79].

Неабходна зазначыць, што ў камсамольскіх ячэйках праца вялася на нацыянальнай мове толькі ў тым выпадку, калі ўсе члены ячэйкі былі адной нацыянальнасці. Такіх ячэек было адносна мала. Таму большасць камсамольскіх ячэек працавалі на рускай мове [20, с. 184].

У пачатку 1920-х гг. беларусізацыя навучальных устаноў, стварэнне культурна-асветных гурткоў адбывалася дзякуючы намаганням у першую чаргу маладых беларусаў, сярод якіх пераважалі беспартыйныя, але было нямала камуністаў і эсэраў [25, с. 166, 173].

Сіламі беларускіх навучэнцаў і студэнтаў пры многіх школах ствараліся тэатральныя і гісторыка-краязнаўчыя гурткі, харавыя калектывы. Яны адыгрывалі важную ролю ў пашырэнні беларускай нацыянальнай самасвядомасці. Дзейнічалі і беларускія вясковыя культурна-асветніцкія гурткі, у якія ўваходзіла таксама ў асноўным моладзь.

Пераломным для савецкай нацыянальнай палітыкі стаў красавік 1923 г., калі на XII з'ездзе РКП(б) была звернута ўвага на неабходнасць вырашэння нацыянальнага пытання ў СССР. У рэалізацыі гэтай задачы павінен быў актыўна ўдзельнічаць і камсамол. Таму на VI з'ездзе КСМБ, які адбыўся 4–8 мая 1923 г. у Мінску, упершыню з'явіліся афіцыйныя дакументы саюза на беларускай мове і было абмеркавана пытанне «Быт і мова ў выхаваўчай рабоце камсамола» [1, арк. 48–49]. У выніку 19 ліпеня 1923 г. Бюро ЦК камсамола ССРБ на чале з М. Кузеніцам стварыла спецыяльную камісію для распрацоўкі нацыянальных пытанняў працы [26, арк. 34, 36, 73; 27, арк. 2].

Аднак, нягледзячы на тое, што з канца жніўня 1923 г. у ячэйках камсамола заахвочвалася праца з юнакамі і дзяўчатамі на іх роднай мове, рэальна яна амаль не вялася. Беларускія аб'яднанні ў ячэйках КСМБ на вёсцы пасутнасці не ствараліся [26, арк. 75; 28, арк. 3; 29, арк. 22].

Асобныя камсамольцы і ячэйкі саюза праяўлялі ініцыятыву ў выкарыстанні беларускай мовы, але вырашаць пытанне беларусізацыі было складана. Частка членаў КСМБ па-ранейшаму не разумела права беларусаў называцца нацыяй і мець сваю форму савецкай дзяржаўнасці [29, арк. 8]. У выніку працэс беларусізацыі саюза ішоў маруднымі тэмпамі.

Важную ролю ў актывізацыі беларусізацыі адыграў VIII з'езд КП(б)Б, які адбыўся 12–14 мая 1924 г. у Мінску і рэкамендаваў камсамолу рэспублікі весці працу сярод юнакоў і дзяўчат на іх роднай мове, спрыяць развіццю на-

цыянальнай культуры [20, с. 164]. У адпаведнасці з партыйнымі рашэннямі адбыліся змены ў кіраўніцтве ЛКСМБ. З 26 ліпеня 1924 г. ЦК саюза ўзначаліў М. Арэхва, які настойліва праводзіў ідэю актывізацыі беларусізацыі ў маладзёжным асяроддзі [3, арк. 114].

Аднак толькі ў снежні 1924 г. у праграму самаадукацыі камсамольскага актыва былі ўключаны пытанні беларусазнаўства. Напрыканцы 1924 г. пры большасці акруговых камітэтаў камсамола былі створаны гурткі беларусазнаўства. На беларускую мову перайшлі камсамольскія ячэйкі педтэхнікумаў і партшкол. На вёсцы гурткі беларусазнаўства ахоплівалі 50 % ячэек саюза [3, арк. 142, 158; 11, арк. 29; 30, арк. 2; 31, арк. 54; 32, арк. 31]. Беларусізацыю актыўна падтрымала беларуская моладзь, асабліва вясковая. Маладыя беларускія патрыёты з энтузіязмам адгукаліся на заклікі Народнага камісарыята асветы БССР, Інстытута беларускай культуры і маладзёжнага літаратурнага аб’яднання «Маладняк», ехалі ў правінцыю, займалі пасады загадчыкаў раённых аддзелаў народнай адукацыі, культурна-асветных клубаў, бібліятэк, настаўнікаў, рэдактараў беларускамоўных газет [25, с. 217–218].

Адной з важкіх падстаў для правядзення палітыкі беларусізацыі ў сярэдзіне 1920-х гг. з’яўляліся сур’ёзныя адносіны маладога пакалення камуністаў на месцах да нацыянальнага пытання [33, с. 57]. Аднак у асяроддзі камсамольцаў не было яснасці і адзінадушша ў пытанні неабходнасці беларусізацыі, а частка актыву саюза нават адкрыта супраціўлялася яе правядзенню. Тым не менш пры камсамольскіх камітэтах і ячэйках у гарадах дзейнічалі гурткі па вывучэнні беларускай мовы і беларусазнаўству, у якіх займаліся актывісты саюза. Камсамольскія арганізацыі практыкавалі правядзенне вечароў беларускага мастацтва. Маладзёжнае літаратурнае аб’яднанне «Маладняк», якое курыраваў камсамол, за 1924–1925 гг. выдала каля 30 зборнікаў вершаў і прозы на беларускай мове [20, с. 183–184].

Ступень пашырэння беларусізацыі ў камсамольскіх структурах была рознай. Найбольш беларусізацыя ахоплівала ячэйкі, менш – апараты раённых і акруговых камітэтаў, а найменш – ЦК ЛКСМБ, які толькі часткова дасылаў матэрыялы на месцы на беларускай мове [21, арк. 8; 34, арк. 50]. Як бачым, працэс беларусізацыі саюза пашыраўся пераважна ў нізавых звеннях.

Разам з тым, не хапала палітычнай і камсамольскай літаратуры на беларускай мове. Беларусы недастаткова вылучаліся ў кадры раённага і акруговага камсамольскага актыву. Сярод гарадской моладзі слаба вялася праца па растлумачэнні неабходнасці вывучэння беларускай мовы [5, арк. 14; 11, арк. 9; 22, арк. 28; 24, арк. 194].

Толькі ў 1925 г. кіраўніцтва КП(б)Б на чале з першым сакратаром А. Крыніцкім паставіла перад ЛКСМБ канкрэтныя задачы па ўцягванні моладзі нацыянальных меншасцей у дзейнасць па эканамічным і культурным развіцці краіны, сціранні любой нацыянальнай розні. У выніку праца структур саюза сярод нацыянальных меншасцей узмацнілася і была арганізацыйна аформлена [5, арк. 14; 11, арк. 28; 12, арк. 62; 22, арк. 27; 23, арк. 7]. У БССР стабільна расла колькасць выданняў маладзёжнай літаратуры на беларускай і яўрэйскай мовах [35, с. 7]. У 1926 г. большасць раённага, акруговага і цэнтральнага актыву ЛКСМБ засвоіла беларускую мову, а «Чырвоная зьмена» цалкам перайшла на яе. Значная колькасць камсамольскага актыву была вылучана з ліку беларусаў [36, арк. 8].

К канцу 1927 г. увесь апарат саюза быў пераведзены на беларускую мову з адначасовым абслугоўваннем моладзі нацыянальных меншасцей на іх роднай мове. У пачатку 1928 г. на беларускую мову была пераведзена праца значнай часткі ячэек. Камсамольскія акруговыя і раённыя канферэнцыі ў падаўляючай большасці адбываліся на беларускай мове, пры значнай частцы ячэек, асабліва вясковых, дзейнічалі беларускія гурткі, быў выдадзены падручнік для палітнавучання камсамольцаў і несаюзнай моладзі на беларускай мове, ва ўсіх камсамольскіх палітшколах праводзіліся заняткі па беларусазнаўству, часопіс «Маладняк» карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод юнакоў і дзяўчат [14, арк. 297; 37, арк. 209].

Аднак практычныя дасягненні структур ЛКСМБ у галіне беларусізацыі былі нераўнамерныя. Цалкам толькі Калінінская акруговая камсамольская арганізацыя перайшла на беларускую мову [38, арк. 26; 39, арк. 76; 40, арк. 11–12]. Разам з тым, са шматлікіх справаздач мясцовых камсамольскіх камітэтаў вынікае, што сярод камсамольцаў і моладзі мелі месца дзясяткі выпадкаў нацыянальнай варожасці і нацыянальнай абмежаванасці, шавінізму, пасіўнага супраціўлення беларусізацыі мову [37, арк. 171; 38, арк. 27; 39, арк. 76–77; 41, арк. 2, 5; 42, арк. 14]. Напрыклад, арганізацыі і актыў студэнтаў БДУ ў большасці выкарыстоўвалі ў сваёй працы беларускую мову. Аднак некаторая частка студэнцтва і выкладчыкаў адмоўна ставілася да беларусізацыі. Справа набывала вострае гучанне ў студэнцкім асяроддзі. Так, маладыя пісьменнікі А. Александровіч, А. Дудар і М. Зарэцкі звярнуліся з адкрытым лістом у газету «Савецкая Беларусь», у якім пратэставалі супраць такіх адносін да беларусізацыі. У сувязі з нядбайным стаўленнем да беларускай мовы маладыя інтэлектуалы адмовіліся працягваць вучобу ў БДУ [43, арк. 175].

Увогуле маладыя беларускія пісьменнікі займалі актыўную пазіцыю ў справе беларусізацыі. У рамках сустрэч з грамадскасцю яны правялі сотні гутарак аб беларускай мове і культуры з мэтай іх папулярызацыі. Нягледзячы на ўсе складанасці, к 1929 г. структуры камсамола БССР дамагліся значных поспехаў у галіне беларусізацыі, развіцці беларускай культуры і працы з моладдзю нацыянальных меншасцей [44, арк. 6; 45, арк. 28; 46, арк. 142; 47, с. 9–10].

Аднак з 1929 г. у гарадскіх арганізацыях і рабочых ячэйках ЛКСМБ беларусізацыя пачала слабець. Некаторыя камсамольскія актывісты пасіўна адносіліся да беларускай нацыянальнай ідэі, а частка акруговага актыву нават супраціўлялася беларусізацыі, бо многія яго прадстаўнікі не валодалі беларускай мовай. Больш таго, у 1930 г. у саюзе ўжо меліся цэлыя камітэты і ячэйкі, якія фактычна сабатавалі правядзенне беларусізацыі [44, арк. 6; 46, арк. 142; 48, арк. 139–140, 161, 180; 49, арк. 63; 50, с. 20; 51, с. 1]. Такое становішча можна растлумачыць разгортваннем масавай калектывізацыі, у ажыццяўленне якой уключыліся кіраўніцтва рэспублікі і грамадскія арганізацыі. Афіцыйна ў 1930 г. у камсамоле БССР адзначалася значнае ўмацаванне міжнацыянальнага адзінства. У рэчаіснасці ж структуры саюза слаба вялі нацыянальную працу і інтэрнацыянальнае выхаванне маладога пакалення. У маладзёжным і камсамольскім асяроддзі працягвалі адзначацца праявы шавінізму і антысемітызму [50, с. 16–17; 52, арк. 288; 53, арк. 168; 54, арк. 1; 55, с. 21, 32].

Важнае месца ў дзяржаўным будаўніцтве займала забеспячэнне неабходнай абароназдольнасці краіны. Таму патрабавалася належная падрыхтоўка дапрызыўнікаў. Выкананне гэтай надзвычай важнай задачы разам з Усенавучам (сістэма абавязковай ваеннай падрыхтоўкі грамадзян) у значнай ступені было ўскладзена на камсамол. Пры камсамольскіх камітэтах былі створаны ваенна-спартыўныя аддзелы або камісіі, якія працавалі з дапразыўнікамі, кіравалі ваенна-шэфскай працай. Члены саюза накіроўваліся паліткіраўнікамі ў групы Усенавуча. Але ў гэтай дзейнасці не хапала планавасці і сістэмнасці, актыўнага ўдзелу ўсіх камсамольскіх ячэек [56, арк. 58; 57, арк. 1; 58, арк. 1; 59, арк. 3].

Як вядома, з 16 кастрычніка 1922 г. камсамольцы савецкіх рэспублік ўзялі шэфства над ваенна-марскім флотам. КСМБ стаў шэфам лінкора «Парижская коммуна». Яго экіпаж у асноўным папаўняўся камсамольцамі БССР. Шэфская праца разгортвалася даволі паспяхова, з актыўным удзелам друку камсамола. Калі ЦК РКСМ забараніў шэфства над асобнымі вайсковымі часткамі і суднамі, КСМБ стаў лічыцца шэфам Балтыйскага флоту. Аднак не без праблем у працы шэфскіх камісій і зборы шэфскіх узносаў [60, арк. 66; 61, арк. 18].

У красавіку 1923 г. было створана Беларускае таварыства сяброў паветранага флоту, якое разгарнула працу па прыцягненні моладзі да заняткаў авіяспортам і мадэляваннем. Ужо 25 мая 1923 г. КСМБ стаў калектыўным членам таварыства [11, арк. 208; 62, арк. 17]. У другой палове 1924 г. адбыліся змены ў арганізацыі шэфскай працы. Камсамольцы БССР зноў сталі шэфамі не ўсяго Балтыйскага флоту, а толькі лінкора «Парижская коммуна» [63, с. 14].

Камсамольцы ініцыявалі збор сродкаў на абарону краіны. Юнакамі і дзяўчатамі БССР была падтрымана ініцыятыва моладзі Мінска і Барысава аб штомесячным адлічэнні ў фонд абароны аднадзённага заробку. На сродкі, сабраныя камсамольцамі рэспублікі былі пабудаваныя самалёты «Камсамольскія крылы», «Комсамол Беларусі», «Совецкая Беларусь», «Беларускі селянін» і інш. [64, с. 45–46].

У пачатку 1925 г. праца камсамола сярод дапрызыўнікаў значна палепшылася. Важную ролю ў падрыхтоўцы маладога пакалення да абароны Айчыны адыгравалі спецыялізаваныя грамадскія арганізацыі. З 1921 г. вайскова-навуковае таварыства (з 1926 г. таварыства садзейнічання абароне); з 1923 г. Беларускае таварыства сяброў паветранага флоту і з 1924 г. Таварыства сяброў хімічнай абароны і хімічнай прамысловасці, якія ў 1925 г. аб’ядналіся ў Таварыства сяброў авіяцыйнай і хімічнай абароны і прамысловасці. У 1927 г. яно аб’ядналася з таварыствам садзейнічання абароне ў Саюз таварыстваў сяброў абароны і авіяцыйна-хімічнага будаўніцтва СССР (Осаавіяхім). Яны навучалі моладзь асновам ваеннай справы ў дапрызыўны перыяд, аб’ядноўвалі ў сваіх шэрагах найбольш актыўных, свядомых і ініцыятыўных маладых людзей з усіх сацыяльных слаёў і груп насельніцтва [65, с. 11–16].

З 1927 г. усталявалася цесная сувязь Осаавіяхіма і ЛКСМБ. Аднак рэалізаваць абавязковы характар ваеннага навучання не ўдалося нават унутры камсамольскіх арганізацый. Значныя праблемы меліся і ў Осаавіяхіме. У большасці структур таварыства адсутнічаў належны колькасны і якасны ўлік членаў. У некаторых акругах камсамольцаў проста абавязвалі быць членамі

Осаавіяхіма, што прыводзіла да нізкай адказнасці за працу ў таварыстве і вялікага недаатрымання членскіх узносаў (да 25 %) [15, арк. 4; 66, арк. 95, 98–99; 67, арк. 88–89].

Пашыраліся і шэфскія абавязкі ЛКСМБ. Так, у 1930 г. саюз стаў шэфам Аб'яднанай беларускай ваеннай школы, якой у выніку камсамольскімі структурамі аказвалася матэрыяльная і культурная дапамога. Аднак шэфства ЛКСМБ над флотам зноў аслабла [52, арк. 293; 68, арк. 75], што можна растлумачыць крызісным становішчам унутры саюза з-за ажыццяўлення палітыкі масавай прымусовай калектывізацыі.

Такім чынам, кіраўніцтва БССР адводзіла камсамолу важную ролю ў сістэме кіравання. Саюзу аказвалася вялікая падтрымка на дзяржаўным узроўні. Моладзь актыўна ўключалася ў органы ўлады і кіравання, асабліва ў Саветы. Паступова адбываўся рост ролі і ўплыву ЛКСМБ. Аднак гэты працэс ішоў адносна павольна і відавочна не паспяваў за тэмпамі прыцягнення моладзі да працы ў Саветах, што сведчыла як аб значнай грамадскай актыўнасці маладога пакалення, так і аб наяўнасці адпаведнай дзяржаўнай палітыкі па актыўным прыцягненні здольнай моладзі да працы ў органах улады і кіравання незалежна ад яе прыналежнасці да камсамола. У цэлым рост грамадска-палітычнай актыўнасці юнакоў і дзяўчат БССР на працягу 1920-х гг. быў нестабільны.

Таксама неабходна адзначыць, што ўвесь разглядаемы перыяд сістэма палітасветы маладога пакалення адчувала недахоп дапаможнікаў і літаратуры, а структуры камсамола недастаткова кантралявалі палітасветработу. Тым не менш станоўчыя вынікі ў справе арганізацыі і пашырэння палітасветы сярод юнакоў і дзяўчат, безумоўна, меліся.

Да верасня 1924 г. інтэрнацыянальнае выхаванне маладога пакалення і нацыянальная праца сярод яго ў БССР вяліся эпізадычна. Толькі ў 1925 г. нацыянальная дзейнасць структур ЛКСМБ узмацнілася і была арганізацыйна аформлена. Сярод моладзі нацыянальных меншасцей прыярытэт аддаваўся працы з яўрэямі, палякамі і латышамі. Пры гэтым кіраўніцтва саюза шмат увагі таксама звяртала на ажыццяўленне беларусізацыі. Свайго піка беларусізацыя ў ЛКСМБ дасягнула ў 1928 г., а з 1929 г. пачала слабець, што можна патлумачыць унутраным крызісам у саюзе з-за абвастрэння грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага становішча ў сувязі з правядзеннем масавай калектывізацыі. Акрамя таго ў маладзёжным асяроддзі назіраўся рост праяў шавінізму, антысемітызму і нацыянальнай адасобленасці.

Разам з тым, у 1920-я гг., нягледзячы на розныя недахопы і складанасці, ваенна-патрыятычнае выхаванне юнакоў і дзяўчат стала адным з найважнейшых напрамкаў работы камсамола і абаронных таварystваў. Значная ўвага ў дзейнасці камсамола адводзілася ваенна-патрыятычнай шэфскай працы па розных напрамках.

## Бібліяграфічныя спасылкі


10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 19.
11. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 27.
12. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 33.
13. Жукович, Г. С. Участие комсомола в государственном управлении. Минск: Наука и техника, 1969.
14. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 42.

15. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 73.
16. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 128.
17. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 424.
18. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 537.
19. Чарвякоў, А. Чарговая справаздачна-выбарчая кампанія саветаў. Даклад т.Чарвякова на III сэсіі ЦВК БССР IX склікання // Савецкая Беларусь. 1930. 26 сьнежня.
20. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 37.
21. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 39.
22. Очерки истории Ленинского комсомола Белорусии. Минск: Беларусь, 1975.
23. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 81.
24. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 78.
25. Коммунистическая партия Советского Союза. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и Пленумов ЦК (1898–1988) [в 16 т.] под общ. ред. А. Г. Егорова, К. М. Боголюбова. М., 1983–1990. Т. 4. 1984.
26. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 110.
27. НАРБ. Ф. 2884. Воп. 1. Спр. 313.
28. НАРБ. Ф. 2884. Воп. 1. Спр. 343.
29. Журов А. Под руководством партии. Деятельность КПБ по созданию и руководству комсомолом Белоруссии (1918–1925 гг.). Минск: Беларусь, 1970.
30. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 44.
31. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 46.
32. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 53.
33. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 49.
34. Ляхоўскі, У. Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.) / У. Ляхоўскі. – 2-е выд. Смаленск, 2015.
35. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 22.
36. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 24.
37. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 20.
38. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 26.
39. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 32.
40. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 35.
41. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 49.
42. Беларусізацыя. 1920-я гады. Дакументы і матэрыялы. Мінск: БДУ, 2000.
43. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 64.
44. 10 год Ленінскага комсамолу Беларусі. Матэрыялы для дакладаў аб гадавіне ЛКСМБ. Мінск, 1928.
45. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 251.
46. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 174.
47. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 66
48. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 306.
49. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 304.
50. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 297.
51. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 364.
52. НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 1580.
53. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 88.
54. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 421.
55. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 448.
56. Рэзолюцыі III пленуму ЦК ЛКСМБ (люты 1929 г.). Мінск: Чырвоная зьмена, 1929.
57. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 93.
58. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 523.
59. Шоламаў, Е. Работа ЛКСМБ па нацыянальна-культурным будаўніцтве: даклад на студзеньскім пленуме ЦК ЛКСМБ. Мінск, 1930.
60. Ударны квартал 5-цігодкі – палітычны экзамен камсамолу. Да ўсёй камсамольскай арганізацыі Беларусі // Чырвоная зьмена. 1930. 13 кастрычніка.
61. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 101.
62. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 545.

63. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 554.
64. Панцюхаў ЛКСМБ на пavароце: даклад на студзеньскім пленуме ЦК ЛКСМБ аб выніках абсьледаваньня работы комсамолу Беларусі, праведзенага ЦК УсеЛКСМ. Мінск, 1930.
65. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 7.
66. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 10.
67. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 6.
68. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 7.
69. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ). Ф. М1. Воп. 23. Спр. 68.
70. РДАСПГ. Ф. М1. Воп. 23. Спр. 115.
71. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 23.
72. Школа мужества и патриотизма. Краткий очерк истории ДОСААФ Белорусской ССР. Минск, 1988.
73. Дваццаць год Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі (гістарычная даведка). Мінск, 1940.
74. ДОСААФ Республики Беларусь: люди, события, факты. Минск, 2007.
75. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 369.
76. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 373.
77. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 108.

**Ходзін Сяргей Мікалаевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ЯК ФАКТАР РАЗВІЦЦЯ МАДЭРНІЗАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ У БЕЛАРУСІ Ў 1920-я гг.

Для разумення пераемнасці розных перыядаў нашай гісторыі выключнае значэнне мае вывучэнне сістэмы каштоўнасцей, звычак, традыцый, рэлігійных і міфічных уяўленняў, а таксама абумоўленых імі форм сацыяльных паводзін. Адпаведнасць сацыяльнай і гаспадарчай практыкі нацыянальным традыцыям спрыяе эканамічнаму поспеху, або яго істотна замаруджвае яго ў выпадках, калі не прымаецца ва ўвагу спецыфіка культуры і гістарычнага вопыту нацыі. Нацыянальныя традыцыі аб'ядноўваюць і мабілізуюць сілы грамадства, арыентуючы іх у кірунку найбольшай эфектыўнасці эканамічнага развіцця. Значэнне нацыянальных традыцый асабліва ўзрастае ва ўмовах мадэрнізацыі грамадства, пад час актывізацыі трансфармацыйных працэсаў. Традыцыя як сацыяльная форма выяўлення агульнага закона пераемнасці валодае ўстойлівасцю, якая дазваляе збіраць культурны вопыт, ажыццяўляць яго перадачу, а дынамічнасць садзейнічае ўзбагачэнню, узаемадзеянню традыцый з іншымі з’явамі грамадскага жыцця. Фарміруючыся на працягу шматлікіх стагоддзяў, традыцыя назапашвае гістарычны вопыт і забяспечвае ўзаемасувязь паміж мінулым і сучасным

Гісторыкі маюць справу не з нейкай абстрактнай чалавечай істотай, а з чалавекам, які жыве пэўным часам, у канкрэтнай мясцовасці, мае свой жыццёвы і генетычна запазычаны вопыт продкаў. Спалучэнне геаграфічнага і гістарычных фактараў утварае пэўныя матывы гаспадарчых паводзін: «пачуццё агульнасці», «пачуццё справядлівасці». У традыцыйным грамадстве роля асобы выяўляецца найперш ва ўмовах адпаведнасці яе дзейнасці пэўным правілам, якія фарміраваліся на працягу стагоддзяў і правяраліся практыкай штодзённага жыцця. Вяртанне да гісторыі як навукі